УДК 37.012-808.53

**А. М. Гацко**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 208 7995, philology@lenta.ru

## ПРАБЛЕМА ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНА-ДЫСКУРСІЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ПЕДАГАГІЧНЫМ АСПЕКЦЕ

У артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты праблемы камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры: яе змест, актуальнасць, суадносіны з культурай грамадства, педагагічнай і камунікатыўнай культурай; вылучаюцца функцыянальныя кампаненты.

**Ключавыя словы:** камунікатыўна-дыскурсіўная культура; дыскурсіўная кампетэнцыя; матывацыйна-каштоўнасная функцыя; інфармацыйна-кагнітыўная функцыя; рэгулятыўная функцыя; эмацыянальна-ацэначная функцыя; этыкетная функцыя; ментальная функцыя; культуратворчая функцыя.
Бібліягр.: 6 назваў.

**A. M. Gatsko**
Baranovichi State University, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 21 Voykova Str., 225404 Baranovichi, the Republic of Belarus, +375 (29) 208 79 95, philology@lenta.ru

## PROBLEM OF FORMING COMMUNICATIVE AND DISCURSIVE CULTURE IN THE PEDAGOGICAL ASPECT

The article deals with the problem of communicative and discursive culture: its content, relevance, correlation with culture of the society and pedagogical and communicative culture. Also, its functional components are marked.

**Key words:** communicative and discursive culture; discourse competence; motivational and axiological function; informative and cognitive function; regulatory function; emotional and evaluative function; etiquette function; mental function; culture creation function**.**
Ref.: 6 titles.

**Уводзіны.** Неабходнай умовай грамадскага развіцця на сучасным этапе з’яўляецца забеспячэнне стабільнага функцыянавання і абнаўлення сістэмы адукацыі, што ў многіх краінах выступае прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай палітыкі. Паводле Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», асноўным яе вынікам павінна стаць валоданне суб’ектам адукацыі ключавымі кампетэнцыямі ў інтэлектуальнай, грамадзянска-прававой, камунікатыўнай, інфармацыйнай і культурнай галінах.

**Метадалогія і метады даследавання.** Айчыннымі і замежнымі вучонымі ў пэўнай меры даследаваны розныя аспекты прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі, аднак новыя тэндэнцыі развіцця грамадства, выхад на міжнародны ўзровень супрацоўніцтва ў самых разнастайных сферах палітыкі, эканомікі, культуры абумоўліваюць і пастаноўку адукацыйных задач, якія б улічвалі гэтыя тэндэнцыі. Перад вышэйшай педагагічнай школай асабліва востра паўстае задача далучэння

© Гацко А. М., 2019

індывіда да ўніверсальных каштоўнасцей, фарміраванне ўменняў камунікацыі ў полікультурным соцыуме. Гэта абумовіла значнасць полікультурных аспектаў універсітэцкай падрыхтоўкі, наяўнасць даследаванняў у галіне полікультурнай адукацыі. Сёння менавіта камунікатыўная культура будучых настаўнікаў дае магчымасць устанаўлення пазітыўных кантактаў з аўдыторыяй, спрыяе прафесійнай самарэалізацыі.

**Арганізацыя даследавання.** У тэарэтычных і практыка-арыентаваных даследаваннях прадстаўнікоў сучаснай педагагічнай навукі назіраецца павышаная ўвага да феноменаў прафесійна-педагагічнай культуры, удакладняецца сутнасць паняццяў «прафесійная камунікацыя», «міжкультурная камунікацыя», «дыскурс»; высвятляецца іх месца і роля ў дзейнасці педагога.

Аналізуючы сучасныя даследаванні (А. Л. Бердзячэўскага, Г. Д. Дзмітрыева), мы прыйшлі да высновы, што сёння існуе неабходнасць фарміравання ў будучых педагогаў новага тыпу культуры, якая забяспечвае паспяховую камфортную камунікацыю, грунтуецца на лінгвістычных (тэкстаўтвараючых) і экстралінгвістычных (камунікатыўныя ўстаноўкі, мэты, сацыяльныя ролі, фонавыя веды аб умовах камунікацыі і інш.) асаблівасцях моўнага ўзаемадзеяння партнёраў. Гэты від культуры вызначаем як камунікатыўна-дыскурсіўную культуру.

Каб выявіць тэарэтыка-педагагічныя аспекты заяўленай праблемы, неабходна даць азначэнне камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры, вызначыць яе змест, разгледзець суадносіны з культурай грамадства, педагагічнай і камунікатыўнай культурай. Аналіз паняцця «культура» дазваляе наблізіцца да разумення феномена педагагічнай культуры.

Існуе меркаванне, што ўпершыню паняцце «педагагічная культура» было выкарыстана ў працах В. А. Сухамлінскага [1, с. 19]. Яе асновай выдатны педагог лічыў выхаванне ў настаўніка такіх пачуццяў, як любоў да дзяцей, здольнасць знаходзіць радасць у размовах з імі, адчуваць і разумець стан душы навучэнца. Асаблівую ўвагу В. А. Сухамлінскі ўдзяляў эмацыянальнай культуры педагога, якая выяўляецца ў камунікацыі на ўроку, але не ў меншай меры — па-за класам. Педагагічная культура, у яго разуменні, складалася з чатырох кампанентаў: 1) веданне навукі, выкладаемага прадмета, развіццё здольнасцей да самастойнага даследавання; 2) павага да асобы навучэнца, вера ў яго, улік інтарэсаў дзяцей; 3) псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць; 4) валоданне ўменнямі якой-небудзь працоўнай дзейнасці.

Такім чынам, у педагагічнай тэорыі В. А. Сухамлінскага педагагічная культура разглядаецца як індывідуальная, асобасная характарыстыка педагога, звязаная з яго педагагічнай і выхаваўчай дзейнасцю.

Праблема педагагічнай культуры знайшла сваё адлюстраванне ў працах М. Ц. Грамковай, І. Ф. Ісаева, В. А. Сласценіна. Тэарэтыка-метадалагічным асновам і асобным аспектам педагагічнай культуры прысвечаны даследаванні Я. В. Бандарэўскай і Н. Б. Крыловай. У даследаваннях Я. В. Бандарэўскай найбольш поўна разгледжаны пытанні сусветнай культуры, сацыякультурнай прасторы, асобасна-арыентаванай адукацыі, навуковага статусу педагагічнай культуры. Пад педагагічнай культурай яна разумее частку агульначалавечай культуры, у якой адлюстраваны духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці адукацыі і выхавання, а таксама спосабы творчай дзейнасці, неабходныя для сацыялізацыі асобы, ажыццяўлення адукацыйна-выхаваўчых працэсаў [2, с. 39].

Культуру педагога і педагагічную культуру Н. Б. Крылова разглядае як паняцці з рознай семантыкай і лічыць, што культура педагога — комплексная з'ява са шматузроўневай структурай, якая ўключае, у параўнанні са структурай педагагічнай культуры, дадатковыя кампаненты [3].

На аснове кампанентаў сучаснай культурнай парадыгмы адукацыі прадстаўляецца мэтазгодным вылучыць наступныя функцыянальныя кампаненты педагагічнай культуры:

– інтэлектуальная культура (здольнасць рацыянальнага пазнання і мыслення);
– інфармацыйная культура (здольнасць арыентавацца ў інфармацыйнай плыні);

– прававая культура (сацыяльна значымыя паводзіны, прадугледжаныя нормамі права);

– маральна-эстэтычная культура (прызнанне агульначалавечых маральных каштоўнасцей, нормаў паводзін);

– камунікатыўная культура (дзейнасць і гатоўнасць ажыццяўляць зносіны з улікам сацыяльнага статусу камунікантаў);

– метадычная культура (прафесійныя ўменні: праектуючыя, арганізацыйныя, камунікатыўныя, матывацыйныя, даследчыя).

Даследаванне праблемы фарміравання камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры рэалізуецца на аснове аналізу сутнасці і зместу паняцця «камунікатыўная культура» ў педагагічным аспекце. Генезіс паняцця «камунікатыўная культура» закладзены ў вызначэнні камунікатыўнай кампетэнцыі.

У пачатку 90-х гадоў ХХ стагоддзя паняцце «камунікатыўная кампетэнцыя» трактуецца вучонымі як здольнасць і гатоўнасць ажыццяўляць моўныя зносіны (Н. Д. Гальскова, Я. М. Колкер, Т. А. Крыўчанка і інш.). У канцы ХХ стагоддзя ў навуковы ўжытак уводзіцца паняцце «камунікатыўная культура», што звязана з наступнымі фактамі: 1) зменай сацыякультурнага кантэксту вывучэння мовы; 2) прызнаннем мэты навучання мове як сродку зносін і далучэння да духоўнай спадчыны народа; 3) узрастаннем адукацыйнай і самаадукацыйнай функцый мовы ва ўстановах вышэйшай адукацыі, прафесійнай значымасці мовы на рынку працы ў цэлым; 4) прызнаннем моўнай культуры часткай агульначалавечай культуры.

У даследаваннях сучасных вучоных камунікатыўная культура разглядаецца на розных узроўнях:

а) макраўзроўні — як камунікатыўныя паводзіны народа; кампанент, фрагмент яго нацыянальнай культуры, які адказвае за камунікатыўныя паводзіны нацыі [4, с. 112];

б) мезаўзроўні — як сукупнасць уменняў і навыкаў, што забяспечваюць добразычлівыя ўзаемадзеянні людзей адзін з другім, эфектыўнае рашэнне задач камунікацыі; важны сродак адукацыі і вынік развіцця асобы [5];

в) мікраўзроўні — як здольнасць і гатоўнасць рэалізоўваць моўныя і нямоўныя паводзіны згодна задачам зносін з улікам статусу камунікантаў, усведамлення нацыянальна-культурнай базы роднай мовы [5].

У сувязі са зменамі парадыгмы вышэйшай педагагічнай і лінгвістычнай адукацыі ў якасці новай мэтавай умовы выступае падрыхтоўка студэнтаў — будучых настаўнікаў да рэальнай міжкультурнай камунікацыі. Таму змест культурнага кампанента набывае асаблівае значэнне. Асновай прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца авалоданне культурай (далучэнне да роднай культуры); вывучэнне культуры (далучэнне да замежнай культуры), у выніку якіх адбываецца станаўленне бікультурнай асобы.

Адэкватнасць моўных і нямоўных паводзін камунікантаў спецыфіцы канкрэтнага культурнага супольніцтва, культурнаму фону, камунікатыўным традыцыям магчыма пры наяўнасці ў камунікантаў высокага ўзроўню дыскурсіўнай кампетэнцыі. Дыскурсіўная кампетэнцыя разглядаецца як неабходны кампанент камунікатыўнай культуры, які ўключае веданне розных тыпаў дыскурсаў і правілаў іх пабудовы, уменне ствараць і разумець іх з улікам сітуацыі зносін.

Праблема фарміравання дыскурсіўнай кампетэнцыі актыўна даследуецца замежнымі і айчыннымі вучонымі. Значны ўклад у яе распрацоўку ўнеслі Х. Бойер (H. Boyer), С. Маран (S. Moirand), Т. А. ван Дэйк, А. І. Кучарэнка.

Дыскурсіўны рэжым камунікацыі дапускае наяўнасць пэўных суб'ектаў і агентаў, прадметаў мовы, сітуацыі. Таму дыскурс можна трактаваць як аб'ектыўную сукупнасць правіл гаварэння, якія ўласцівы мове пэўных груп ці мове пэўнай функцыянальнай накіраванасці; «дыскурсіўнасць» зносін дапускае наяўнасць пэўных нормаў, правілаў і інтэрпрэтацый, якія папярэднічаюць акту камунікацыі і ўвасабляюцца ў гэтым акце [6, с. 144].

У мове дыскурсіўнага рэжыму можна выдзеліць тры аспекты: працэсуальны, працэдурны і мэтавы. Працэсуальны аспект дыскурсу выражаецца ў пошуку адэкватных сродкаў рэалізацыі камунікатыўных інтэнцый удзельнікаў камунікацыі; працэдурны аспект звязаны з устанаўленнем нарматыўных патрабаванняў да афармлення дыскурсу (тэматызацыі праблемы, актуалізацыі камунікатыўнага вопыту, талерантнасці ў ацэнцы пазіцыі камунікантаў); мэтавы аспект вызначаецца імкненнем удзельнікаў камунікацыі дабіцца ўзаемаразумення на аснове пошуку культурных сродкаў выражэння думкі.

Вышэйсказанае дае падставы выдзеліць самастойны від камунікатыўнай культуры: камунікатыўна-дыскурсіўную культуру як здольнасць і гатоўнасць ажыццяўляць камунікацыю з улікам асаблівасцей успрымання, разумення, аналізу і стварэння дыскурсаў, а таксама прадуцыраваць акт камунікацыі з выкарыстаннем розных тыпаў дыскурсаў на аснове ствараемай сітуацыі.

Камунікатыўна-дыскурсіўная культура ўяўляе сабой самастойны феномен, які з'явіўся на мяжы стагоддзяў і патрабуе больш дэталёвага даследавання. Яна з'яўляецца састаўной часткай агульначалавечай культуры, прадстаўленай сістэмай матэрыяльных, духоўных і фізічных кампанентаў, якія функцыянуюць у культурах краіны, народа, сацыяльных і прафесійных груп.

Змест камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры раскрываецца як сістэма індывідуальна-прафесійных якасцей, вядучых кампанентаў і функцый. Функцыі, уяўляючы сабою знешнія праяўленні ўласцівасцей суб'екта ў сістэме адносін, вызначаюць спецыфіку камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры як здольнасці і гатоўнасці будучых настаўнікаў ажыццяўляць камунікацыю.

Правядзём аналіз сутнасці камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры згодна з наступнымі крытэрыямі: функцыі міжкультурнай камунікацыі; стратэгіі рэалізацыі дадзеных функцый у розных відах дыскурсу, камунікатыўныя уменні для ажыццяўлення вылучаных функцый (табліца 1).

Такі аналіз мэтазгодны для вызначэння функцыянальных кампанентаў камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры будучых спецыялістаў.

Т а б л і ц а 1. — Функцыянальны аналіз сутнасці паняцця «камунікатыўна-дыскурсіўная культура»

| Функцыі міжкультурнай камунікацыі | Стратэгіі рэалізацыі функцый у розных відах дыскурсаў | Камунікатыўныя ўменні |
|---|---|---|
| Матывацыйна-каштоўнасная | Успрыманне, аналіз і разуменне дыскурсу на аснове матываў камунікатыўнай дзейнасці з улікам каштоўнасцей культуры | Уменні ўспрымання, аналізу, інтэрпрэтацыі інфармацыі |
| Інфармацыйна-кагнітыўная | Запыт і паведамленне інфармацыі, яе ўспрыманне і асэнсаванне ў дыскурсах прафесійнай дзейнасці | Уменні ўспрымання, асэнсавання і трансфармацыі інфармацыі |
| Рэгулятыўная | Пабуджэнне, просьба, парада, дамоўленасць, успрыманне пабуджэння і рэакцыя на яго ў дыскурсах | Уменні выявіць камунікатыўны намер і стымуляваць камунікацыю |
| Эмацыянальна-ацэначная | Выказванне меркавання, ацэнкі, выяўленне эмоцый адносна ўспрынятай інфармацыі ў дыскурсах сацыяльна-культурнай сферы | Уменне дэцэнтралізацыі, пазарацыянальнага разумення ўнутранага свету |
| Этыкетная | Падтрыманне размовы, інтарэсу да суразмоўцаў у дыскурсах усіх тыпаў | Уменне моўнага этыкету, вядзення і афармлення дыялогу |

*Працяг табліцы 1*

| Функцыі міжкультурнай камунікацыі | Стратэгіі рэалізацыі функцый у розных відах дыскурсаў | Камунікатыўныя ўменні |
|---|---|---|
| Ментальная | Супастаўленне моўных інтэнцый суразмоўцаў з улікам культурнага менталітэту і вопыту ў дыскурсах афіцыйнага і сацыякультурнага характару | Уменне крытычнага мыслення і ўспрымання асаблівасцей культуры |
| Культуратворчая | Пабудова і рэалізацыя працэсу камунікацыі з улікам культурнага кампанента дыскурсу | Уменні сацыякультурнага канструявання |

Праведзены аналіз дазволіў вылучыць функцыянальныя кампаненты камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры будучых педагогаў, якія ўяўляюць сабой базавыя сувязі паміж зыходным станам структурных кампанентаў дадзенай сістэмы і канчатковым вынікам яе функцыянавання. Функцыянальныя кампаненты камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры адлюстроўваюць дыялектычную, шматузроўневую і дынамічную прыроду дадзенага фенomena, яе цэласны, развіваючы характар. Кожная з вылучаных функцый міжкультурнай камунікацыі, для рэаалізацыі якой неабходна валоданне камунікатыўна-дыскурсіўнай культурай, адлюстроўвае розныя спосабы рэалізацыі камунікатыўных інтэнцый удзельнікаў у розных умовах дыскурсіўнага рэжыму.

**Заключэнне.** Да тэарэтыка-педагагічных аспектаў праблемы камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры мы адносім сістэму навуковых паняццяў і пунктаў гледжання, якія адлюстроўваюць розныя падыходы да выяўлення сутнасці камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры, яе асаблівасцей, структуры і этапаў фарміравання, у прыватнасці:

1) сутнасць камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры разглядаецца з пазіцыі вызначэння спецыфікі родавага паняцця «педагагічная культура»;

2) камунікатыўна-дыскурсіўная культура звязана з педагагічнай культурай у сацыяльна-педагагічным і індывідуальна-асобасным планах.

Камунікатыўна-дыскурсіўная культура разглядаецца як самастойнае навуковае паняцце і трактуецца як здольнасць і гатоўнасць ажыццяўляць камунікацыю з улікам асаблівасцей успрымання, разумення, аналізу і стварэння дыскурсаў. Да функцыянальных кампанентаў камунікатыўна-дыскурсіўнай культуры, якія былі вылучаны на аснове аналізу функцый камунікацыі, адносяцца: матывацыйна-каштоўнасны, інфармацыйна-кагнітыўны, рэгулятыўны, эмацыянальна-ацэначны, этыкетны, ментальны і культуратворчы.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Исаев, И. Ф.* Профессионально-педагогическая культура преподавателя / И. Ф. Исаев. — М. : Академия, 2002. — 208 с.

2. *Бандарэўская, Я. В.* Педагагічная культура як грамадская і асобасная каштоўнасць / А. В. Бандарэўская // Педагогіка. — 2001. — № 3. — С. 37—43.

3. *Крылова, Н. Б.* Формирование культуры будущего специалиста / Н. Б. Крылова. — М. : Высш. шк., 2004. — 142 с.

4. *Конаржевский, Ю. А.* Анализ урока / А. Ю. Конаржевский. — М. : Пед. поиск, 2000. — 336 с.

5. *Стерлин, И. А.* О понятии коммуникативного поведения / И. А. Стерлин // Язык и наука конца XX века. — М., 2000.

6. *Ячин, С. Е.* Диалог как коммуникативный режим / С. Е. Ячин, М. Ю. Орлова // Человек. — 2001. — № 5. — С. 142—148.

Паступіў у рэдакцыю 06.11.2018